# НАУЧНАЯ ЖИЗНЬ

## XVIII МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ «БЕЛАРУСЬ І ГЕРМАНІЯ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ» У МДЛУ

5 красавіка 2019 г. кафедрай гісторыі, сусветнай культуры і турызму МДЛУ і аддзелам ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі была праведзена XVIII міжнародная навуковая канферэнцыя «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць», прысвечаная 75-годдзю вызвалення Беларусі ад германскіх захопнікаў. У канферэнцыі прынялі ўдзел даследчыкі з розных навуковых, вучэбных, архіўных і музейных устаноў Беларусі (Брэст, Віцебск, Гомель, Мінск, Магілёў, Полацк), Германіі (Берлін, Мюнхен), Літвы (Вільнюс), Польшчы (Гданьск) – усяго 41 гісторык.

Адкрываючы канферэнцыю, прарэктар па навуковай працы ўніверсітэта, сустаршыня аргкамітэта Л. А. Тарасевіч адзначыла, што гэта сустрэча праходзіць у своеасаблівы час у жыцці нашай краіны – 75-годдзя вызвалення Беларусі ад германскіх захопнікаў. Канферэнцыя праводзіцца ў рамках Дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў на 2016–2020 гг. «Гісторыя, культура, грамадства і дзяржава». Адметнасцю ў бягучым годзе з’яўляецца таксама тое, што яна праходзіць у адпаведнасці з Пратаколам даручэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка і Федэральнага прэзідэнта Германіі Ф.-В. Штайнмайера аб стварэнні беларуска-германскай гістарычнай камісіі. У рамках яе падрыхтоўкі загадчык кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму кандыдат гістарычных навук, дацэнт С. Я. Новікаў браў удзел у сустрэчах гісторыкаў абедзвюх краін ва ўніверсітэце Гісена (снежань 2018 г.) і Інстытуце гісторыі НАН Беларусі (люты 2019 г.).

На заканчэнне прарэктар універсітэта выказала ў адрас удзельнікаў канферэнцыі пажаданні творчых поспехаў і спадзяванне, што ў ходзе сустрэчы будзе зроблены важкі крок у напрамку далейшага ўзбагачэння гістарычнай навукі новымі знаходкамі, цікавымі не толькі для шырокай навуковай грамадскасці, але і для беларускага студэнцтва, у тым ліку і нашага ўніверсітэта.

Праца канферэнцыі ладзілася ў фармаце пленарных пасяджэнняў, абагульніўшых навуковыя даклады і паведамленні ў рамках трох праблемных палёў: 1) Вызваленне БССР – вызваленне Беларусі: дакументальны наратыў і даследчыцкія падыходы; 2) Вялікая Айчынная вайна: людзі – падзеі – факты; 3) Беларусь і Германія: гісторыя – культура – памяць.

На пленарных пасяджэннях, якія праходзілі ў Цэнтры беларускай мовы і культуры, вяліся плённыя дыскусіі, адбылася тэматычная размова з удзелам прафесіяналаў і пачынаючых даследчыкаў, якія самаахвярна займаюцца вывучэннем ваеннай гісторыі Беларусі. Кожнае з пленарных пасяджэнняў

уяўляла сабой самастойную міні-канферэнцыю, у цэнтры якой знаходзілася актуальная гістарычная праблематыка, прадстаўленая ў форме навуковых дакладаў і паведамленняў.

У ходзе першага пасяджэння «Вызваленне БССР – вызваленне Беларусі: дакументальны наратыў і даследчыцкія падыходы» былі заслуханы навуковыя даклады айчынных і замежных даследчыкаў, у тым ліку: К. Янэке (Берлін), С. Я. Новікава (Мінск), М. Віткунаса (Вільнюс), Ю. фон Зааль (Мюнхен), У. К. Коршука (Мінск), А. В. Шаркова (Мінск) і А. І. Корсак (Полацк).

Пачатак пленарнага пасяджэнне меў сваю адметнасць, звязаную з тым, што ўдзельнікі канферэнцыі ўшанавалі памяць аднаго з дакладчыкаў – навуковага супрацоўніка Інстытута найноўшай гісторыі ў Мюнхене доктара гісторыі Юргена Царускі – мінутай маўчання. Свой даклад ён збіраўся прысвяціць штоквартальніку, які выходзіць у Інстытуце найноўшай гісторыі (г. Мюнхене) з 1953 г. і на старонках якога не раз друкаваліся матэрыялы аб германскай акупацыі Беларусі 1941–1944 гг. Аднак пачуць гэтае выступленне не ўдалося па прычыне заўчаснай смерці выступоўцы якраз напярэдадні канферэнцыі 4 красавіка 2019 года.

Нямецкі музеязнавец К. Янэке раскрыла характар узаемадачыненняў, якія мелі месца паміж выканаўцамі сумеснага беларуска-германскага праекта ў ходзе стварэння сумеснай германска-беларускай выставы «Лагер смерці “Трасцянец”. Гісторыя і памяць», а таксама паказала новае вымярэнне гэтага гістарычнага месца з улікам існуючых фактаў мемарыялізацыі, якія адбываліся на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Трасцянец» цягам часу з чэрвеня 2015 па сакавік 2019 года. Нямецкі музеязнавец адзначыла, што на цяперашні момант у выніку праведзеных мерапрыемстваў па ўшанаванні памяці ахвяр нацысцкіх забойстваў ва ўрочышчах Благаўшчына, Шашкоўка і побач з вёскай Малы Трасцянец створаны «мемарыяльны ландшафт», а не мемарыяльны комплекс. Даследчык прыйшла да высновы, што адным з важных фактараў своечасовай падрыхтоўкі і адкрыцця выставы на высокім дзяржаўным узроўні можна лічыць нямецкую адказнасць, у першую чаргу кураторства праекта з боку міністэрства замежных спраў Германіі, а таксама своечасовасць выканання планаў па забудове мемарыяльных аб’ектаў комплексу з беларускага боку.

С. Я. Новікаў у сваім выступленні ўпершыню звярнуўся да навуковага аналізу нарытыву, які склаўся ў найноўшай айчыннай і замежнай гістарыяграфіі ў дачыненні да гісторыі вызвалення Беларусі ў канцы 1943–1944 гг. Даследчык прыйшоў да высновы, што на цяперашні час прычынай разыходжання ў навуковых ацэнках фактаў, падзей і вынікаў баявых дзеянняў Чырвонай арміі і германскага вермахта з’яўляецца адсутнасць даследаванняў, якія праводзяцца на аснове метаду кампаратыўнага аналізу як гістарыяграфічных фактаў, так і наяўнай базы дакументальных крыніц.

Літоўскі ваенны гісторык М. Віткунас спыніўся на сучаснай рэфлексіі гістарычнай памяці ва ўзброеных сілах Літвы і суседніх краінах, пазнаёміўшы ўдзельнікаў канферэнцыі з новымі ацэнкамі былой савецкай гістарычнай спадчыны, у тым ліку рознымі поглядамі на ход і наступствы вызваленчага паходу Чырвонай арміі ў Еўропу ў 1944–1945 гг. Нямецкі гісторык Ю. фон Зааль прадставіла розныя ацэнкі ўспрыняцця новага мемарыялу ў Трасцянцы пад Мінскам сучаснай Еўропай, дзе амаль што ў кожнай краіне вядуцца навуковыя дыскусіі вакол пытанняў аб Халакосце.

Прафесар У. К. Коршук працягнуў тэму нацысцкіх лагераў на акупаванай тэрыторыі Беларусі, змясціўшы ў фокус свайго паказу лёс вязняў Азарыцкага лагера смерці, трагедыю, як вядома, перажылі дзясяткі тысяч не толькі сталых людзей, жанчын, але і малалетніх дзяцей. А. В. Шаркоў спыніўся на жахлівых фактах людской трагедыі, якая адбылася 14 студзеня 1944 г. у в. Ола Светлагорскага раёна, дзе адбылася больш маштабная, чым у Хатыні, трагедыя з мірнымі жыхарамі колькасцю 1758 чалавек, з якіх 950 былі дзеці. А. І. Корсак прысвяціла сваё выступленне маладаследаванай тэме вайсковых пахаванняў, якія вяліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі. Даследчык прывяла выснову свайго даследавання пра тое, што верыфікацыя звестак пра колькасць пахаваных пераконвае ў адсутнасці на цяперашні час сістэматызаванай базы даных пра гэту катэгорыю загінуўшых.

Загадчык кафедры гісторыі Беларусі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна прафесар У. В. Здановіч спыніўся на разглядзе міжнацыянальных адносін у гады Вялікай Айчыннай вайны, якія адлюстроўвае сучасная ўкраінская гістарыяграфія. Старшы навуковы супрацоўнік аддзела ваеннай гісторыі Беларусі І. Ю. Варанкова раскрыла некаторыя аспекты ваеннага будаўніцтва і палітычнай абстаноўкі ў Беларускай ССР у сувязі з польскім паходам Чырвонай арміі ў 1939 г., што знайшло адлюстраванне ў дакументах ЦК КП(б)Б і СНК БССР. Дацэнт кафедры дыпламатычнай і консульскай службы І. М. Кузняцоў пазнаёміў з вынікамі даследавання аб ваенным палоне і інтэрніраванні ў БССР (1939–1941). Галоўны спецыяліст навуковага аддзела Музея гісторыі Другой сусветнай вайны ў Гданьску доктар Дз. Панцьё спыніўся на малавядомых аспектах гісторыі паўсядзённасці, якую ён раскрыў на прыкладзе выданняў мясцовага друку ў Стоўбцах і Слоніме ў 1941–1944 гг.

Загадчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін БДАТУ Я. А. Грэбень прапанаваў разгляд матэрыялаў аб матэрыяльным становішчы грамадзянскага насельніцтва ва ўмовах нацысцкай акупацыі Беларусі, падрыхтаваных па выніках асабістых сустрэч з мясцовымі жыхарамі і ўспамінаў тых, хто перажыў акупацыю. Вядучы супрацоўнік музея гісторыі Другой сусветнай вайны ў Гданьску В. Лукашун спыніўся на тэме «Халакост у Польшчы ў пачатку Другой сусветнай вайны: малавядомыя старонкі».

На другім пленарным пасяджэнні прагучалі даклады М. В. Стральца (Брэст), А. М. Літвіна (Мінск), С. В. Кулінка (Мінск), А. А. Крыварота (Мінск) і Ф. А. Свінціцкага (Магілёў).

Прафесар М. В. Стралец прадставіў у сааўтарстве з старшым выкладчыкам кафедры гуманітарных навук БрДТУ С. А. Пцічкінай вынікі даследавання аб вядомым военачальніку, Герої Савецкага Саюза І. М. Манагараве, якому выпаў надзвычай складаны шлях у гады вайны. Загадчык аддзела ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі прафесар А. М. Літвін падзяліўся новымі фактамі аб удзеле фінансавых работнікаў у партызанскім руху Беларусі ў 1941–1944 гг. Загадчык аддзела інфармацыі і навуковага выканання дакументаў Беларускага дзяржаўнага архіва навукова-тэхнічнай дакументацыі С. В. Кулінок распавёў пра гісторыю ўзаемадзеяння БШПР з саюзнымі, рэспубліканскімі і тэрытарыяльнымі органамі НАУС/НКДзБ і органамі ваеннай контразведкі «СМЕРШ» па пытанні аб выяўленні нямецкай агентуры. Вядучы навуковы супрацоўнік аддзела ваеннай гісторыі Інстытута гісторыі НАН Беларусі А. А. Крыварот распавёў пра маштабы ўзаемадзеяння партызан Беларусі, Латвіі, Літвы, паказаныя ў гістарыяграфіі савецкага перыяду. Палкоўнік у адстаўцы Ф. А. Свінціцкі пазнаёміў удзельнікаў з асаблівасцямі партызанскага руху на Магілёўшчыне на працягу ўсяго перыяду яго дзеяння ў 1941–1944 гг.

У паведамленнях, заслуханых на другім пленарным пасяджэнні, звярталася ўвага на новыя дакументальныя знаходкі, гістарыяграфічныя факты і даследчыцкія ацэнкі, ў тым ліку па малавядомых старонках гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У ходзе пасяджэння прагучалі паведамленні, якія закранал наступную тэматыку: «Фінансавая дзейнасць эмісійнага банка “Остланд” у Мінску (1941–1944)» (І. Я. Куракова), «Арганізацыя ўпраўлення партызанскімі фарміраваннямі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны» (Дз. А. Козел), «Выжыванне пасля вызвалення: 1944–1945 гг. (у дыскурсе вуснай гісторыі)» (А. В. Сумко), «Дакументальныя фільмы “Ахвяры абвінавачваюць”: перспектывы даследавання гістарычнай крыніцы» (В. А. Латышава), «Савецкі Саюз і германскае пытанне на завяршальным этапе Вялікай Айчыннай вайны» (І. А. Літвіноўскі, Ю. І. Літвіноўская), «Зборнік успамінаў і артыкулаў “Няскораная Беларусь” як крыніца па гісторыі Беларускага штаба партызанскага руху» (М. М. Скамарошчанка), « “Новы парадак”: аспекты жыццёвай практыкі насельніцтва ва ўмовах ваеннага часу 1941–1943 гг. (на матэрыялах Добрушскага раёна)» (Л. С. Скрабіна), «Лагойскі раён у гады Вялікай Айчыннай вайны» (Л. А. Осіпава), «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт у гады Вялікай Айчыннай вайны» (Г. С. Хадасевіч), «120-ы авіяполк (Беларуская група) грамадзянскага паветранага флоту ў гады Вялікай Айчыннай вайны» (М. Б. Шчаўлінскі), «Становішча насельніцтва на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941–1944) паводле матэрыялаў калекцыі Генеральнага камісарыята “Беларусь”» (А. Г. Цымбал).

У час правядзення трэцяга пленарнага пасяджэння былі заслуханы даклады і паведамленні, у якіх аўтары звярталіся да такіх важных аспектаў гісторыі, як беларуска-нямецкія ўзаемадачыненні ў гістарычнай і культурнай прасторы, а таксама ў справе ўшанавання памяці пра ахвяр вайны. Прафесар

кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі БДПУ імя М. Танка І. Р. Чыкалава адкрывала пасяджэнне дакладам «Станаўленне германістыкі як вобласці гістарычных даследаванняў у Расійскай імперыі». Доктар мастацтвазнаўства прафесар кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму МДЛУ А. М. Кушнярэвіч так вызначыў тэму свайго выступлення: «Нямецкія ўплывы ў беларускім жывапісе XIX ст.». Аб нацыянальных школах на беларускіх землях напярэдадні і ў гады Першай сусветнай вайны паведамілі дацэнт Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь В. П. Дзмітрыева і дацэнт БДПУ імя М. Танка У. У. Куніцкі. Старшы навуковы супрацоўнік аддзела ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі М. М. Смальянінаў засяродзіў увагу аўдыторыі на пытанні аб вызваленні беларускіх зямель ад германскіх акупантаў у 1918 годзе.

Даследчыкі І. С. Благуш, В. В. Брыгадзіна, А. У. Ціманава-Кузняцова, П. А. Канцавы і А. Г. Цымбал прадставілі свае даследаванні па наступных тэмах: экспартны патэнцыял прамысловасці ва ўмовах постіндустрыяльнага развіцця: урокі Германіі і выклікі для Беларусі; прававое палажэнне расійскай эміграцыі ў Германіі ў 1920-я – пачатак 1930-х гадоў; паўсядзённае жыццё сельскага насельніцтва Маладзечненскай вобласці (верасень 1944 – май 1945 гг.); выкарыстанне германскага рэпарацыйнага абсталявання на адноўленых і зноў пабудаваных прамысловых прадпрыемствах Беларусі (1945 – пачатак 1950-х гг.); беларускае пытанне ў Заходняй Беларусі (1921–1939) у міжваеннай польскай гістарыяграфіі.

Завяршылася канферэнцыя ўспамінамі пра нямецкага гісторыка Юргена Царускі (28.04.1958 – 04.04.2019). Пра яго жыццёвы шлях, даследчыцкія напрацоўкі, навуковыя дасягненні і асабістыя ўражанні ад сустрэч з ім расказаў С. Я. Новікаў. З навуковымі дасягненнямі нямецкага даследчыка пазнаёміў удзельнікаў сустрэчы М. В. Стралец.

У заключэнне былі падведзены вынікі канферэнцыі, навукоўцы адзначылі, што міжнароднае супрацоўніцтва з'яўляецца адметнай прыкметай сустрэч у МДЛУ. Добрай традыцыяй стала таксама рэгулярнае выданне і прадстаўленне ў час заключнага пасяджэння чарговага зборніка матэрыялаў міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць».

***Сяргей Новікаў,***
сустаршыня аргкамітэта канферэнцыі
кандыдат гістарычных навук

*Поступила в редакцию 20.03.2020*

**В. Н. Усоский**

## СУЩНОСТЬ ПЛАТФОРМЕННОЙ МОДЕЛИ БИЗНЕСА

26–28 ноября 2019 г. Московский финансовый университет при правительстве Российской Федерации провел VI Международный форум «Рост или рецессия: к чему готовиться». Одна из актуальных тем, обсуждаемых на